УДК 621.9

# СУВЯЗЬ ПОЧЫРКА І ХАРАКТАРУ ЧАЛАВЕКА

Ю. А. ШАРЫПАЎ
Навуковы кіраўнік Н. У. ФЁДАРАВА
БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Графалогія – гэта вучэнне пра почырк, даследаванне яго з пункту гледжання адлюстравання ў ім якасцяў і псіхічных станаў пішучага. Так, часам па почырку пра чалавека можна даведацца больш, чым пры размове.

Спецыялісты па почырку могуць амаль упэўнена дыягнаставаць неўрозы, алкагалізм, наркаманію, схільнасць да самагубства, істэрыю і нават сухоты.

Але, каб даведацца што-небудзь цікавае пра чалавека, які даслаў вам ліст, неабавязкова быць графолагам. Кожны можа скарыстацца наступнымі крытэрыямі: нахіл, накірунак радка, водступ, памер літар, палі, вуглы і дугі, асобныя літары, подпіс і росчырк.

Так, напрыклад, шырокі водступ – гэта прыкмета вялікай павагі да адрасата, жаданне спадабацца. Вузкі – наадварот: ці абыякавае стаўленне, ці адсутнасць павагі. З іншага боку, вузкі водступ часам дазваляюць сабе вельмі блізкія людзі, якія на падсвядомым узроўні ўжо даўно даказалі адзін аднаму сваю павагу.

Шырокае прымяненне графалогія знайшла ў касмічнай медыцыне. Аналіз запісаў, зробленых касманаўтамі ва ўмовах арбітальных касмічных палётаў, выкарыстоўваецца спецыялістамі для ацэнкі функцыянальнага стану цэнтральнай нервовай сістэмы касманаўтаў, іх адаптацыйных здольнасцяў у цэлым.

У крыміналістыцы графалогія выкарыстоўваецца не толькі для ідэнтыфікацыі асобы (почырк кожнага чалавека індывідуальны, як індывідуальна і яго падсвядомасць), але і для ацэнкі ўмоў напісання тэкстаў, стану пішучага, такіх як: нервовае напружанне, псіхічнае засмучэнне, траўма, алкагольнае ап'яненне і інш.

Графалогія, вычышчаная ад містычнага налёту, выкарыстоўваецца ў сучаснай клінічнай медыцыне. Даследаванне почырка пры медыцынскім абследаванні мае значныя перавагі перад іншымі метадамі – яно не патрабуе асаблівых затрат часу і бязбольна для пацыента.

Такім чынам, почырк чалавека, нягледзячы на шматлікія даследаванні, усё яшчэ ўяўляе загадку для чалавецтва, пры гэтым, аднак, у выніках нельга быць упэўненым на 100 %. Графалогія можа стаць выдатным сродкам псіхалагічнага самавыяўлення, даць магчымасць зразумець не толькі свой скрыты патэнцыял, але і здольнасць хутка і дакладна ацэньваць людзей вакол сябе.